Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
____________С. Л. Шпарло
“22” ___06___ 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 340 /навуч.

# НУМІЗМАТЫКА

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.04.2022 № 75, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І. Н. Колабава*, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.А. Гулак*, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*М. М. Елінская*, вядучый рэферэнт аддзела арганізацыйнай работы, інфармацыі і выкарыстання дакументаў Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол №10 ад 19.05.2022)

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 21.06.2022)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Нумізматыка” прызначана студэнтам спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)”.

Мэтай выкладання вучэбнай дысцыпліны “Нумізматыка” з’яўляецца вывучэнне студэнтамі гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Нумізматыка” спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Актуальнасць дадзенай вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны “Нумізматыка” акрэслівае шэраг задач:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця спецыяльных гістарычных дысцыплін;

– выявіць характэрныя асаблівасці сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі на прыкладзе нумізматычных калекцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” прадугледжана фарміраванне наступнай кампетэнцыі:

СК – 4 Прымяняць метады і дасягненні археалогіі, рэлігіязнаўства і спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі музейных крыніц, вызначэння агульнага і асаблівага ў развіцці сусветных рэлігій.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Нумізматыка” студэнты павінны *ведаць*:

– прадмет даследавання дысцыпліны “Нумізматыка”;
– прыёмы і аб’екты даследавання дысцыпліны “Нумізматыка”;
– інфармацыйныя крыніцы ў дадзеным кірунку;
– методыку самастойнай работы з крыніцай і апрацоўкі інфармацыі;
– гістарычныя ўмовы развіцця нумізматыкі;
– методыку выкарыстання набытых ведаў у музейнай працы;
– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

Студэнты павінны *ўмець*:

– выкарыстоўваць прыёмы і метады спецыяльных гістарычных дысцыплін;

– выкарыстоўваць даныя спецыяльных гістарычных дысцыплін пры правядзенні практычнай і навуковай работы;

– праводзіць навуковую апрацоўку музейных калекцый;

– выкарыстоўваць інфармацыйныя крыніцы ў музейнай працы;

– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны *валодаць*:

– прафесійнымі навыкамі аналіза і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў у галіне спецыяльных гістарычных дысцыплін;

– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах, якіх знаходзяцца нумізматычныя калекцыі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны "Нумізматыка" выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп'ютарныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці можа выкарыстоўвацца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыцы правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараненне методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Нумізматыка" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ("Археалогія", "Этналогія і этнаграфія Беларусі", "Гісторыя Беларусі" і інш.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Нумізматыка" прадугледжана ўсяго 100 гадзін, аўдыторных – 50 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 30 гадзін – лекцыі, 20 гадзін – семінарскія заняткі. Форма кантролю ведаў – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны. Прадмет, задачы і крыніцы нумізматычных даследаванняў. Нумізматычнае калекцыяніраванне. Станаўленне навуковай нумізматыкі. Гістарыяграфічны агляд

Вызначэнне нумізматыкі як навуковай дысцыпліны. Этымалогія тэрміна нумізматыка. Прадмет, задачы, крыніцы нумізматыкі. Нумізматычнае калекцыяніраванне. Гістарыяграфічны агляд развіцця навуковай нумізматыкі ў Беларусі.

Сувязь нумізматыкі з іншымі гістарычнымі дысцыплінамі (гісторыя, археалогія, музеязнаўства, этнаграфія, сфрагістыка, фалерыстыка і інш.).

Буйнейшыя нумізматычныя зборы ў музеях Беларусі і замежжа.

Тэма грошай у літаратуры, мастацтве, фальклоры.

### Раздзел I Асновы агульнай нумізматыкі

#### Тэма 1 Уласцівасці тавару і функцыі грошай

Вызначэнне паняццяў тавар, грошы.

Уласцівасці тавару (спажывецкая вартасць, менавая вартасць, вартасць).

Таварагрошы – іх функцыі і роля ў таварным абарачэнні. Даманетныя металічныя сродкі грашовага абарачэння.

Уласцівасці металічных грошай (стабільная менавая вартасць, кампактнасць, фізічнае даўгалецце і інш.).Функцыі грошай.

#### Тэма 2 Манета. Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манеты нерэгулярных эмісій. Манета ў нумізматычным зборы

Этымалогія тэрміна манета. Манета як аснова нумізматычнага даследавання. Першыя манеты (Старажытны Кітай, Лідзія, Эгіна).

Грашовая сістэма. Асноўныя, зборныя і дробныя (разменныя) грашовыя адзінкі. Рэальная і намінальная вартасці манеты.

Эканамічны закон грашовага абарачэння Каперніка-Грэшэма.

Матэрыяльныя характарыстыкі манеты. Металы (умоўныя вызначэнні), маса, манетная стапа, манетная проба (залатніковая, каратная, лотавая, метрычная). Лігатура.

Знешнія характарыстыкі манеты (форма, поле, выявы, аверс, рэверс, гурт, легенда, тып і інш.).

Манеты нерэгулярных эмісій. Памятныя (мемарыяльныя), пробныя, данатыўныя, манеты надзвычайных абставін, антыкварныя падробкі, прыватныя грошы, манеты-перайманні, наваробныя манеты, фальшывыя манеты.

Правядзенне чысткі і кансервацыі манет.

Навуковая апрацоўка нумізматычных помнікаў.

Сістэма вызначэння калекцыйнай вартасці і ступені рэдкасці манет.

## Тэма 3 Тэхніка манетнай вытворчасці

Манета як помнік гісторыі тэхнічнай думкі.

Агульная характарыстыка вырабу манет тэхнікай ліцця.

Агульная характарыстыка тэхнікі ручной чаканкі манет (падрыхтоўчыя работы, выраб манетных пласцін і манетных штэмпеляў, выраб манет, верыфікацыя манет).

Тэхніка выраблення "драцяных" манет.

Тэхніка вырабу брактэятаў.

Механізацыя працэсаў вырабу манеты (выкарыстанне шрубавага прэса, паравога рухавіка, электрычнасці). Тэхніка вальцверк. Гурцільная машына. Сучасныя манетаробныя машыны.

Хібнасці пры чаканцы манет (памылкі ў легендзе, гібрыдныя манеты, двайны ўдар, змяшчэнне штэмпеля і інш.).

## Тэма 4 Скарбы – помнікі гісторыі і культуры. Манета ў побыце, звычаях і вераваннях

Скарбы – матэрыяльныя сведчанні шырока распаўсюджанага да XIX ст. спосаба захавання каштоўнасцей.

Скарбы як рэгулятары грашовага абарачэння. Скарбы грашовыя і грашова-рэчавыя.

Класіфікацыя скарбаў (страчаныя, зваротныя, незваротныя /культавыя ахвяраванні/, часовыя, доўгатэрміновыя, надзвычайных абставін, фальшывых манет).

Прынцыпы датавання скарбаў. Аналіз тапаграфіі знаходак скарбаў на тэрыторыі Беларусі. Знаходкі грашовых і грашова-рэчавых скарбаў на тэрыторыі Беларусі.

Захаванне скарбаў у музейных зборах як адзінага комплексу.

Буйнейшыя зборы скарбаў у музеях Беларусі.

Дзяржаўнае заканадаўства ў дачыненні да скарбаў.

Тэма скарбаў у фальклоры. Антрапаморфныя і зааморфныя сведчанні аб наяўнасці скарбаў. Падзел скарбаў на "злыя" і "добрыя". Захаванне скарбаў добрымі (бялун, купальскі дзядок) і цёмнымі сіламі (палявік, лесавік, дрыгавік, кладавік). Рукапісныя "Траўнікі", "Вызыўныя кнігі", "Роспісы".

Тэма скарбаў у літаратурных творах.

Манета ў побыце, звычаях і вераваннях. Графіта на манетах і грашовых злітках.

Кашалькі для захавання манет (матэрыял, форма). Знаходкі кашалькоў у культурных слаях старажытных гарадоў.

Выкарыстанне манет у якасці ўпрыгажэння (падвескі, маністы, завушніцы).

Выкарыстанне манет як узнагароджанне, падарунак, у вясельным, паграбальным абрадах, закладка манеты пад вугал падмурка, аздабенне манетамі абразоў, ахвяраванні багам.

## Раздзел II Гісторыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі (канец II – пачатак XXI ст.)

### Тэма 5 Перыяд рымскага дэнарыя (2-я палова II – 1-я палова V ст.)

Перыядызацыя гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.

Асноўныя наміналы перыяду рымскага дэнарыя (дэнарыі, аўрэусы, сестэрцыі). “Бурштынавы” шлях.

Спецыфіка выкарыстання антычных манет на тэрыторыі Беларусі. Спыненне сістэматычнага паступлення антычных манет на тэрыторыю Беларусі – прычыны і наступствы.

Аналіз тапаграфіі знаходак антычных манет на тэрыторыі Беларусі. Знаходкі скарбаў рымскіх манет на тэрыторыі Беларусі.

### Тэма 6 Перыяд куфічнага дзірхама (IX – 80-я гг. X ст.)

Куфічны дзірхам. Паходжанне тэрмінаў куфічны, дзірхам.

Дзірхамы – першыя паўнавартасныя грошы на тэрыторыі Беларусі.

Грашовая тэрміналогія (нага́та, ку́на, рэза́на, ве́кша).

Вызначэнне і характарыстыка асобных этапаў у перыядзе куфічнага дзірхама (IX ст. – 833; 833–900; 900–938; 938–980-я гг.).

Спыненне сістэматычнага паступлення куфічнага дзірхама на тэрыторыю Беларусі – прычыны і наступствы.

Выкарыстанне дзірхамаў у ювелірных вырабах.

Аналіз тапаграфіі знаходак куфічных дзірхамаў на тэрыторыі Беларусі.

Знаходкі скарбаў куфічных дзірхамаў на тэрыторыі Беларусі.

### Тэма 7 Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – 60-я гг. XI ст.)

Заходнееўрапейскія дэнарыі, іх мясцовыя назвы.

Аналіз тапаграфіі знаходак заходнееўрапейскіх дэнарыяў на тэрыторыі Беларусі.

Спыненне сістэматычнага паступлення заходнееўрапейскіх дэнарыяў на тэрыторыю Беларусі – прычыны і наступствы.

Візантыйская чаканка (намісмы, міліярысіі, фолісы).

Першыя манеты Русі – златнікі і срэбранікі.

Знаходкі скарбаў перыяда заходнееўрапейскага дэнарыя на тэрыторыі Беларусі.

### Тэма 8 Безманетны перыяд (другі) (канец XI – XIII ст.)

Выкарыстанне ў грашовым абарачэнні зліткаў (грыўні-рублі, палціны). Кіеўскі, наўгародскі, літоўскі тыпы зліткаў.

Грашова-вагавая сістэма. Грыўня як вагавая адзінка для срэбра.

Узгадванне грашовых тэрмінаў у пісьмовых крыніцах.

Аналіз тапаграфіі знаходак зліткаў на беларускіх землях.

Знаходкі скарбаў безманетнага перыяда на тэрыторыі Беларусі.

## Тэма 9 Перыяд пражскага гроша (XIV–XV стст.)

Пражскі грош. Беларускія пісьмовыя крыніцы аб пражскім грошы. Мясцовая тэрміналогія (шырокі, добры, прагскі, плоскі, чэскі).

Склад скарбаў з пражскімі грошамі на тэрыторыі Беларусі.

Аналіз тапаграфіі знаходак пражскага гроша на тэрыторыі Беларусі.

Спыненне сістэматычнага паступлення пражскіх грошаў на тэрыторыю Беларусі – прычыны і наступствы.

Лічыльна-грашовая і вагавая сістэмы Вялікага Княства Літоўскага (рубель, палціна, капа, паўкапы, грыўня).

Пачатак складання манетнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Выпускі першай уласнай манеты Вялікага Княства Літоўскага – літоўскага дэнарыя (пенязя).

Аналіз тапаграфіі знаходак літоўскага дэнарыя на тэрыторыі Беларусі.

Іншаземная манета (шылінгі Лівонскага ордэна, пулы Залатой Арды, ангельскія ноблі (карабельнікі), вугорскія дукаты і інш.) у грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі

Мясцовая тэрміналогія (гатавізна і інш.).

Вагавая сістэма (грыўня, вярдунак, скойц, кварта).

Знаходкі скарбаў перыяда пражскага гроша на тэрыторыі Беларусі.

## Тэма 10 Грашовае абарачэнне ў канцы XV – сярэдзіне XVII ст.

Развіццё манетнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага (літоўскі грош, талер, дукат).

Суадносіны рыначных курсаў літоўскага і польскага грошаў. Уніфікацыя манетнай сістэмы па рэформе Стэфана Баторыя (1578–1580). Захаванне традыцыйнай сістэмы ўліку на літоўскія і польскія грошы.

Мясцовая тэрміналогія (асмак, лядскі, польскі, сужоны).

Дзейнасць манетных двароў Вялікага Княства Літоўскага.

Лічыльна-грашовыя паняцці (капа, паўкапы, рубель, палціна, злоты).

Талер. Мясцовая тэрміналогія (палашнікі, леўкі, талеры ляўковыя, левікі, крыжовыя, рэялы, рэялавыя). Піліпкі (кантрамаркіраваныя талеры і паўталеры) – першыя крэдытныя грошы Вялікага Княства Літоўскага.

Іншаземная манета – дукаты, партугалы, ноблі, шылінгі Лівонскага ордэна, драйпёлькеры Прусіі, торнэры Шатландыі.

Расійская грашовая сістэма XV–XVII стст. Наўгародка (капейка), дзенга (маскоўка), палушка (палова дзенгі). Грашовая рэформа цара Аляксея Міхайлавіча (1654–1663). Яфімкі з "прыкметай".

Лічбавыя паняцці (алтын, грывеннік, палціна, рубель).

Адносіны беларускага рынку да срэбнай і меднай расійскай манеты.

Знаходкі скарбаў XV – сярэдзіны XVII ст. на тэрыторыі Беларусі.

## Тэма 11 Грашовае абарачэнне ў 2-й палове XVII – канцы XVIII ст.

Манетныя двары Вялікага Княства Літоўскага.

Рэформа Яна Казіміра Вазы (1659–1666). Медныя соліды (шэлягі, барацінкі) і білонныя 30-грашовікі (тымфы). Розніца паміж намінальнай і рэальнай вартасцямі меднага соліда і тымфа. Вынікі і наступствы рэформы.

Пераход на біметалічную медна-срэбную грашовую сістэму. Сутнасць паняцця наддача.

Лічыльныя паняцці.

Грашовыя рэформы 1752, 1766, 1787, 1794 гг. Пачатак грашова-папяровых эмісій Рэчы Паспалітай.

Мясцовая тэрміналогія (курэнцыя, рускі злоты і інш.).

Іншаземная манета – манеты Шведскай Прыбалтыкі, Нідэрландаў, Прусіі, Расіі і інш.

Грашовая рэформа Пятра I (1700 – 1704). Увядзенне манет новага тыпу і дзесяцярычнай грашова-вагавай сістэмы. Расійская манета на беларускім рынку.

Знаходкі скарбаў 2-й паловы XVII – канца XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі.

### Тэма 12 Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII – кастрычніку /лістападзе 1917 г.

Спецыфіка грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі. Працяг абарачэння польскіх, літоўскіх і заходнееўрапейскіх манет. Спроба адкрыцця Полацкага манетнага двара.

Плацінавая расійская манетная чаканка. Пачатак чаканкі "вядомай" манеты, імітуючай галандскі дукат (пучковы, лабанчык, арапчык).

Манеты Каралеўства Польскага ў складзе Расійскай імперыі. Манеты Польскага паўстання 1830–1831 гг. Рагачоўскі манетны скарб (1971).

Папяровыя грошы – асігнацыі (1769). Вадзяныя знакі (філігрань). Умовы захавання пакупніцкай здольнасці папяровых грошай.

Грашовая рэформа Я.Ф.Канкрына (1839–1843) і ўвядзенне срэбнага монаметалізму.

Поўнае зліццё грашовай гаспадаркі Беларусі з агульнарасійскай.

Пецярбургскі манетны двор. Размяшчэнне чаканкі расійскай манеты ў замежжы. Працяг выпуску "вядомай" манеты.

Грашовая рэформа С.Ю.Віттэ (1895–1898) і ўвядзенне залатога монаметалізму.

Развіццё крызісных з'яў у эканоміцы Расійскай імперыі (узрастанне тыражоў папяровых эмісій і знешніх пазык, спыненне абмену банкамі папяровых грошай на золата, знікненне з абарачэння залатых, срэбных, медных манет). Выкарыстанне ў абарачэнні папяровых грашовых сурагатаў (паштовых марак).

Дзейнасць Часовага ўрада ў галіне грашовага абарачэння (аблігацыі "Займа свабоды", крэдытныя (думскія) білеты і казначэйскія знакі – "керанкі"). Інфляцыя.

Асаблівасці грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Першай сусветнай вайны.

Знаходкі скарбаў канца XVIII – кастрычніка /лістапада 1917 г. на тэрыторыі Беларусі.

## Тэма 13 Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік /лістапад 1917 – снежань 1991 г.)

Стварэнне Народнага банка РСФСР (1918). “Грашовы голад” і працяг абарачэння грашовых знакаў царскага і Часовага ўрадаў. Першыя савецкія грашовыя эмісіі.

Саўзнакі. Рэформа 1922–1924 гг. Сутнасць і наступствы. Утварэнне Дзяржбанка СССР (1923). Стабілізацыя фінансавага становішча ў краіне. Папяровыя эмісіі, чаканка манет. Грашовае абарачэнне ў канцы 1920-х – 1930-я гг.

Манетныя двары РСФСР і СССР.

Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.

Манетная і папяровая вытворчасць грошай у СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945).

Грашовае абарачэнне на акупаванай тэрыторыі Беларусі у часы Другой сусветнай вайны (1939 – 1945).

Грашовая рэформа 1947 г. Грашовыя купюры новага ўзору.

Змена маштабу цэн у 1961 г. Грашовыя купюры і манеты новага ўзору.

Памятныя манеты СССР.

Грашовая рэформа 1991 г.

Апошнія грашовыя эмісіі ад імя СССР 1991–1992 гг.

## Тэма 14 Грашовае абарачэнне Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.)

Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Самастойныя грашовыя сродкі Рэспублікі Беларусь. Разліковыя білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 1992–1999 гг.

Дэнамінацыя разліковых білетаў Нацыянальнага банка ў 1994, 2000 г. Білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 2000 г.

Мадыфікацыя банкнот у 2010 і 2011 гг.

Дэнамінацыя 2016 г. Білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 2009 г. Серыя разменных манет.

Памятныя манеты Рэспублікі Беларусь.

## ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінар. заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **НУМІЗМАТЫКА** | | | | | |
| 1 | Уводзіны. Прадмет, задачы і крыніцы нумізматычных даследаванняў. Нумізматычнае калекцыяніраванне. Станаўленне навуковай нумізматыкі. Гістарыяграфічны агляд | 2 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| **Раздзел I Асновы агульнай нумізматыкі** | | | | | |
| 2 | Тэма 1 Уласцівасці тавару і функцыі грошай | 1 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 3 | Тэма 2 Манета. Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манеты нерэгулярных эмісій. Манета ў нумізматычным зборы | 3 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 4 | Тэма 3 Тэхніка манетнай вытворчасці | 1 | 2 | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 5 | Тэма 4 Скарбы – помнікі гісторыі і культуры. Манета ў побыце, звычаях і вераваннях | 1 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| **Раздзел II Гісторыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі (канец II – пачатак XXI ст.)** | | | | | |
| 6 | Тэма 5 Перыяд рымскага дэнарыя (2-я палова II – 1-я палова V ст.) | 1 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 7 | Тэма 6 Перыяд куфічнага дзірхама (IX – 80-я гг. X ст.) | 1 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 8 | Тэма 7 Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – 60-я гг. XI ст.) | 2 | | | падрыхтоўка і праверка электронных |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | прэзентацый |
| 9 | Тэма 8 Безманетны перыяд (другі) (канец XI – XIII ст.) | 2 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 10 | Тэма 9 Перыяд пражскага гроша (XIV–XV стст.) | 2 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 11 | Тэма 10 Грашовае абарачэнне ў канцы XV – сярэдзіне XVII ст. | 2 | | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 12 | Тэма 11 Грашовае абарачэнне ў 2-й палове XVII – канцы XVIII ст. | 2 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 13 | Тэма 12 Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII – кастрычніку /лістападзе 1917 г. | 2 | 2 | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 14 | Тэма 13 Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік /лістапад 1917 – снежань 1991 г.) | 2 | 2 | | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 15 | Тэма 14 Грашовае абарачэнне Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.) | | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| Разам | | 24 | 16 | 10 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### 5.2 Асноўная літаратура

1. Какареко, В.И. Монеты Великого княжества Литовского. 1492–1707 / В.И. Какареко, И.Н. Шталенков. – Минск : Экоперспектива, 2005. – 79 с. : ил.

2. Потин, В.М. Введение в нумизматику / В.М.Потин // Труды Государственного Эрмитажа. – Т. XXVI. – Вып. 6. – Л., 1986. – С. 69–162.

3. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.

4. Спасский, И.Г. Русская монетная система / И.Г. Спасский. – Л.: Аврора, 1970. – 256 с.

### 5.3 Дадатковая літаратура

1. Баюра, А. Денежная реформа 1922–1924 гг. и эмиссии бумажных денег / А. Баюра // Банкаўскі веснік. – 2013. – N 7 [588]. – С. 55–62.

2. Беляков, А.С. Нумизматика / А.С. Беляков / Введение в специальные исторические дисциплины. – М.: Изд-во МГУ, 1990. – С. 81–146.

3. Грузицкий, Ю. Первая послевоенная реформа (к 65-летию денежной реформы 1947 г.) / Ю. Грузицкий // Банкаўскі веснік. – 2013. – N 10 [591]. – С. 56–62.

4. Зварич, В.В. Нумизматический словарь / В.В. Зваріч. – Львов: Вища школа, 1976. –156 с.

5. Какареко, В. Нумизматическое движение в Беларуси / В. Какареко // Материалы Междунар. нумизмат. конф.: «Музеи банков: цели, задачи, возможности», Минск, 23–25 сент. 2003 г. / Нац. банк Респуб. Беларусь. – Банкаўскі веснік [Спецвыпуск]. – 2003. – N 31 [252]. – С. 33–38.

6. Колабава, І.Н. Нумізматыка: вучэбна-метадычны комплекс / І. Н. Колабава. – Мінск: БДУКМ, 2018. – 170 с.

7. Колабава, І.Н. Фальшываманетчыкі ў Беларусі XIX ст. (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / І.Н. Колабава // Дакументальная спадчына Беларусі XIV–XX стагоддзяў, прысвечаная 75–годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, 26 чэрвеня 2013 г. – Мінск, 2014. – С.24–32.

8. Колобова, И. О денежной терминологии на территории Беларуси во второй четверти XIX в. / И. Колобова // Нумизматические коллекции: наследие исторической Литвы и связанных с ней стран – открытия для просвещения и науки : междунар. нумизмат. конф., Вильнюс, 23–25 мая 2012 г. / Нац. музей Литвы. – Vilnius, 2015. – С. 259–265.

9. Мельникова, А.С. Русские монеты от Ивана Грозного до Петра Первого / А.С. Мельникова. – М.: Финансы и статистика, 1989. – 318 с.

10. Орлов, А.П. Бумажные денежные знаки в Беларуси / А.П. Орлов. – Минск: Минская фабрика цветной печати, 2008. – 696 с.

11. Потин, В.М. Монеты. Клады. Коллекции: очерки нумизматики / В.М.Потин. – СПб.: Искусство–СПб., 1992. – 303 с.

12. Рябцевич, В. Клады: атрибуция, классификация, интерпретация / В. Рябцевич // Банкаўскі веснік. – 2005. – N 22 [315]. – С. 54–60.

13. Сотникова, М.П. Древнейшие русские монеты X–XI веков. Каталог и исследование / М.П. Сотникова – М.: Банки и биржи, 1995. – 320 с.

14. Спасский, И.Г. Русское золото. Сборник избранных статей / И.Г. Спасский / Русское золото. СПБ: Изд–во Гос. Эрмитажа, 2013. – 392 с.

15. Узденикoв, В.В. Монеты России XVIII – начала XX века / В.В. Узденников. – М.: Мир Отечества, 1994. – 207 с.

16. Фенглер, Х. Словарь нумизмата / Х. Фенглер, Г. Гироу, В. Унгер. – М.: Радио и связь, 1982. – 328 с.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Вучэбная работа студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі заснавання і дзейнасці беларускіх музеяў.

Найбольш дзейснымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што накіроўваюць студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, садзейнічаюць набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавая, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні курсавой і дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работы студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, падрыхтоўка прэзентацый, складанне бібліяграфічных спісаў і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, на семінарскіх і лекцыйных занятках, а таксама ў час правядзення экзамена.

Выкладчык-прадметнік знаёміць студэнтаў са спецыфікай выканання самастойнай работы і спосабамі яе канролю на ўводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.